УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.82
А 43
ISBN: 978-985-21-0765-5



***Іванова Я. Я.***

# ЗАПАЛЕНЧЫ ПРАЦЭС КАЎТУН І ЯГО АКТУАЛЬНАСЦЬ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Каўтун – гэта запаленне сальных залоз на галаве, пры якім у выніку розных паталагічных працэсаў адбываецца перапляценне валасоў і склейванне іх у асобныя пучкі.

У дадзеным даследаванні мы паспрабуем правесці пра аналіз семантыкі слова *каўтун* у славянскіх мовах, адлюстраваць гісторыю развіцця дадзенага захворвання і высветліць, чаму гэта старажытная хвароба засталася актуальнай да сённяшняга часу.

Аналізуючы паходжанне слова *каўтун*, можна заўважыць сувязь гэтай хваробы ў славян і еўрапейцаў, якія мелі агульнае ўяўленне аб каўтуне як хваробе, звязанай з уплывам дэманічнага зместу на агульнае тэрміналагічнае і лінгвакультурнае значэнне. У славацкай мове слова *škrat, škratek* азначала ‘дух, які нясе багацце’ і ‘каўтун’, у кашубскай мове слова *pı́kas* мае значэнні ‘каўтун’ і ‘злы дух’.

Гісторыя такога захворвання як каўтун або гасцец бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці. Вывучаючы літаратуру аб археалагічных раскопках, можна заўважыць, што зблытаныя валасы ў завіткі, дрэды былі цэлым культам у старажытных егіпцян, якія выказвалі духоўную сувязь з бажаством. Усходнія і заходнія славяне каўтун у валасах звязвалі з нячыстай сілай. Часцей за ўсё каўтун пазначалі як сутнасць, якая пасяляецца ўнутры чалавека і ў пошуках выхаду з цела чалавека залазіць у галаву і сядзіць ў валасах, звіваючы іх у камяк; але часам лічылі, што яго насылае дамавік, дэман ці вядзьмак. У сувязі з гэтым людзі пазбаўляліся ад гэтай пошасці адмысловымі рытуаламі. Напрыклад, хворага загаворвалі на ўсходзе або захадзе сонца, абкурвалі, паілі травяным настоем з амялы. Каўтун забаранялася зразаць – яго трэба было разблытваць па валасіне або чакаць, калі ён адпадзе сам. Невыкананне правіл рытуалу магло прывесці да слепаты, глухаты, страты розуму, смерці. Ад каўтуна засцерагалі усякага роду амулеты. У “Аповесці мінулых гадоў” гаворыцца, што пасля нараджэння дзіцяці вешчуны навязалі яму на галаву наўз́ (абярэг з вузлоў), каб зберагчы немаўля ад хваробы, сурокаў, наслання, а асабліва ад каўтуна. Каўтун быў настолькі страшным захворваннем, што маладыя людзі, якія пакутавалі ад яго, вызваляліся ад службы ў царскай арміі.

З развіццём медыцыны лекары сталі праводзіць даследаванні і прыйшлі да агульнага меркавання, што каўтун – гэта не міфічная істота, а запаленчы працэс, які ўтвараецца ў выніку невыканання чалавекам элементарных правіл асабістай гігіены. Першым з лекараў, хто зразаў каўтуны і рэкамендаваў расчэсваць і часта мыць валасы, быў Вільям Дэвідсан.

На сённяшні дзень гэта захворванне часцей сустракаецца ў жывёл, асабліва ў коней, аднак яно застаецца актуальным і для валасоў чалавека, паколькі назіраецца тэндэнцыя наўмысна не расчэсваць валасы. Важна разумець, што расчэсванне валасоў – гэта не толькі эстэтычны выгляд прычоскі, але і прафілактыка развіцця зблытвання валасоў. Пры расчэсванні валасоў адбываецца раўнамернае размеркаванне сакрэту сальных залоз ад каранёў да кончыкаў, што не дае збірацца ўсяму сакрэту каля каранёў і такім чынам не выклікае запаленняў і развіцця каўтуноў.